*Да 135-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа*

**Т. В. ЛОЙША**,
настаўніца сярэдняй школы № 8 г. Гродна

# ЗАЙМАЛЬНЫ МАТЭРЫЯЛ ПА ТВОРЧАСЦІ ЯКУБА КОЛАСА для вучняў VII—VIII класаў

**Прапануем увазе настаўнікаў дыдактычны займальны матэрыял па творчасці Якуба Коласа, які з'яўляецца працягам артыкула, змешчанага ў № 7 часопіса за бягучы год (с. 49—52).**

**Падрыхтаваны матэрыял дапаможа ўзгадаць творы Якуба Коласа, якія вывучаліся на працягу навучальнага года, зрабіць працэс навучання больш цікавым і разнастайным.**

## VII клас

У сёмым класе вывучаюцца чатыры тэксты Якуба Коласа — «У яго быў свет цікавы...» (урывак з паэмы «Сымон-музыка»), верш «Ручэй», «Дзядзька-кухар» (урывак з паэмы «Новая зямля») і твор «Думкі ў дарозе». На аснове іх складзены наступныя заданні.

**І. Разгадайце наступныя рэбусы.**

1. С  ,Х

*(Смех.)*

2. 1,  А

*(Адзінота.)*

3. М = Т 

*(Тарка.)*

4. Г  ,

*(Грыб.)*

5. Х = К  ,,

*(Куст.)*

6. ЗА12Х 

*(Гарох.)*

7. Д = М
Д, 

*(Думка.)*

8. Е132 

*(Елка.)*

9. П = М
ЯЧ 

*(Ячмень.)*

10. 3214 

*(Лось.)*

**ІІ. Разгадайце крыжаванку.**



1) «Як матулька, ... хіліць голаў над ім».
2) «Часам уначы на яго кіне зрок».
3) «І ўсё стада з смелым гукам ... вядзе стары».
4) «Тысячы, мільёны гадоў пазіраеш ты, без болю, без трывогі, пазіраеш на ўсё роўна...».
5) «Дык дзядзька зараз стаў пакрышку
У чыгунчык ... кідаць з лыжкі».
6) «Гэта быў хлапчук асобны».
7) «І галоўкай заківаюць,
Засмяюцца ...».
8) «І чым жа ... так міла?
Чым так дзяцей яно маніла?»
9) «... быў свежы, такі хвацкі,
Такі салодкі, забіяцкі».

**Адказы:** 1 — вярба; 2 — зорка; 3 — журавель; 4 — неба; 5 — клёцкі; 6 — Сымонка; 7 — васількі; 8 — Ліпава; 9 — сок.

**III. Гульня «Перакладчыкі».** Да рускіх слоў падбярыце беларускія адпаведнікі.

Бабочка, звёздочки, тучки, белка, игра, дорожка, воздух, мельница, тёрка, картофель.

**Адказы:** матылёк, зорачкі, хмаркі, вавёрка, гульня, сцежка, паветра, млын, тарка, бульба.

**IV. Гульня «Расшыфроўшчыкі».** З дапамогай лічбаў зашыфраваны сказ з твора «Думкі ў дарозе». Лічбы адпавядаюць парадкаваму нумару літар у беларускім алфавіце, г. зн. кожная лічба — гэта пэўная літара (ДЖ, ДЗ асобнымі літарамі не лічацца).

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 12 | 21 | 5 | 28 | | 20 | 28 |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 15 | 32 | 19 | 6 | 27 | | 14 | 32 | 15 | 6 |

,

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 15 | 6 | 3 | 32 | 5 | 16 | 14 | 1 | 32 |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 5 | 1 | 18 | 16 | 4 | 1 |

!..

**Адказ.** Куды ты нясеш мяне, невядомая дарога!..

**V. Па малюнку назавіце твор, з якога ўзяты вобраз.**



1. Вярба *(«Ручэй».)*



2. Тарка *(«Дзядзька-кухар».)*



3. Дарога *(«Думкі ў дарозе».)*



4. Ручэй *(«Ручэй».)*



5. Неба *(«Думкі ў дарозе».)*

**VI. Злучыце аўтарскія параўнанні:**

| | |
|---|---|
| 1) чыгунок | А) бы слёзы |
| 2) кропелькі соку | Б) як серп |
| 3) белыя хмаркі | В) як чэрві |
| 4) месячык | Г) бы пан пузаты |
| 5) дзеці мітусяцца | Д) як пух |

**Адказы:** 1Г, 2А, 3Д, 4Б, 5В.

**VII. Гульня «Хто гэта?».** Па апісанні пазнайце героя (Сымонка або дзядзька Антось).

1) «У яго быў свет цікавы».
2) «У дзіцячым быў палоне».
3) «Прыхілен быў да дзетак».
4) «Не падобны на другіх».
5) «З малымі размаўляў, як са старымі».
6) «Утаропіцца, глядзіць».
7) «Усё табе пакажа».
8) «Быў загнаны».
9) «Нялюбы сын».
10) «Майстар быў на штукі».
11) «Не такі, як усе дзеці».
12) «Быў настаўнікам, суддзёю».
13) «Вінаваты без віны».
14) «І ў самоце-адзіноце песні, байкі ён тварыў».
15) «Быў механік на ўсе рукі».
16) «Любіў ён адзіноту».
17) «Быў смешны той часінай».
18) «Як роўны з роўнымі трымаўся».
19) «Жыў, гадаваўся, бы пры сцежцы той гарох».
20) «На руках яго насілі».

**Адказы:** Сымонка — 1, 4, 6, 8, 9, 11, 13, 14, 16, 19; дзядзька Антось — 2, 3, 5, 7, 10, 12, 15, 17, 18, 20.

**VIII. Урывак «Дзядзька-кухар» багаты на выкарыстанне фразеалагізмаў. Якое значэнне маюць наступныя фразеалагізмы?**

| | |
|---|---|
| 1) (Майстар) на ўсе рукі | А) ‘што-н. зусім знікла, прапала, прайшло’ |
| 2) На кукішках (сядзець) | Б) ‘асцярожна намякаць на што-н., каб высветліць абставіны, выведаць што-н.’ |
| 3) На руках насілі | В) ‘выключны, здольны на вельмі многае, здатны да ўсяго’ |
| 4) Збіліся з тропу | Г) ‘зусім малы, малалетні’ |
| 5) Вуды закідае | Д) ‘сагнуўшы ногі ў каленях і трымаючыся на насках’ |
| 6) Хадзіць пяшком пад стол | Е) ‘высока цаніць каго-н., даражыць кім-н.’ |
| 7) Як рукою знімала | Ё) ‘даходзіць да замяшання, разгубленасці; заблытвацца’ |

**Адказы:** 1В, 2Д, 3Е, 4Ё, 5Б, 6Г, 7А.

**IX. «Гульня ў шараду»** (гульня, у час якой неабходна ўтварыць як мага больш новых слоў у пачатковай форме, беручы літары і склады з загаданага слова).

Слова: ТРАВІНКА.

**Прыкладныя адказы:** трава, віна, рак, кара, тара, кава, нара, рана, кран, вата, кіт, арка, ніва, варта, тавар, нітка, карат, рака і г. д.

## VIII клас

У восьмым класе вывучаюцца два творы Якуба Коласа — «О, край родны, край прыгожы!..» (урывак з паэмы «Сымон-музыка») і казка «Хмарка». На аснове іх складзены наступныя заданні.

**I. Разгадайце наступныя рэбусы.**

1. О = У



*(Кут.)*

2.



*(Доля.)*

3. 1367



*(Край.)*

4. К = Р



*(Раса.)*

5.



Е



’

*(Возера.)*

6. Г = Д



’

*(Дуб.)*

7. Г = В

‘



*(Ніва.)*

8. 1236



*(Мора.)*

9. 321 А



*(Гора.)*

10. С = ТР



*(Трава.)*

**II. Разгадайце крыжаванку.**



**1. «Хмарка ідзе далей, толькі ... ад яе праплыве, як здань якая, па жыце».**

**2. «Яна не ведала, з чаго і як радзілася на свет, адкуль узялася яна».**

**3. «О, край родны, край прыгожы! Мілы ... маіх дзядоў!»**

**4. «Стары ..., абмыўшыся дажджом, павесялеў».**

**5. «І вярнулася яна зноў у той ... , адкуль і выйшла».**

**6. «І доўга яшчэ гаманіў, наракаў на Хмарку...»**

**7. «Бедныя ... пільна прыглядаюцца да Хмаркі».**

**8. «Дзесь у небе жалобна пішчэў галодны ...».**

**9. «— Адкуль прыпаўзла, нябога? — спытала ... Хмарку».**

**Адказы**: 1 — цянёк; 2 — хмарка; 3 — кут; 4 — дуб; 5 — край; 6 — Арол; 7 — каласкі; 8 — каршун; 9 — Скала.

**III. Гульня «Расшыфроўшчыкі».** З дапамогай лічбаў зашыфраваны сказ з казкі «Хмарка». Лічбы адпавядаюць парадкаваму нумару літар у беларускім алфавіце, г. зн. кожная лічба — гэта пэўная літара (ДЖ, ДЗ асобнымі літарамі не лічацца).

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 21 | | 19 | 3 | 1 | 10 | 14 |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 18 | 16 | 5 | 15 | 28 | 14 |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 12 | 21 | 20 | 16 | 26 | 12 | 21 |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 18 | 1 | 2 | 16 | 20 | 28 |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 5 | 16 | 19 | 28 | 25 | 29 |

| | | |
|---|---|---|
| 5 | 13 | 32 |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 12 | 16 | 8 | 15 | 1 | 4 | 1 |

.

**Адказ.** У сваім родным куточку работы досыць для кожнага.

**IV. «Дождажык».** Складзіце і запішыце словы з прапанаваных літар:




**Адказы**: рак, кара, тарка, рака, тара, гара, рука, тур, гук, кут, грак, арка, туга, карат, карта, ара, гутарка і г. д.

**V. Гульня «Перакладчыкі».** Да рускіх слоў падбярыце беларускія адпаведнікі.

Кузнечик, праздник, мысль, рисунки, явление, обида, утро, аист, волна, соседка.

**Адказы:** конік, свята, думка, малюнкі, з'ява, крыўда, ранак, бусел, хваля, суседка.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

*Кавалеўская, Н. І.* Займальны матэрыял па навучанню грамаце / Н. І. Кавалеўская. — Мінск : ТАА «Авітон», 1993. — 114 с.

*Лепешаў, І. Я.* Слоўнік фразеалагізмаў : у 2 т. / І. Я. Лепешаў. — Мінск : БелЭн, 2008. — 2 т.

Тлумачальны слоўнік беларускай мовы / пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. — 4-е выд. — Мінск : БелЭн, 2005. — 784 с.